*А. А. Носік*

# МЕЛІЯРАТЫЎНЫЯ І ПЕЯРАТЫЎНЫЯ НАЙМЕННІ ЭМОЦЫЙ ЯК ЧАСТКА ЛЕКСІЧНАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*УО «Белорусский государственный медицинский университет»*

Сучасная лінгвістычная навука надае вялікую ўвагу даследаванням па псіхіцы чалавека, яго эмоцыях, унутраным стане. У моўнай карціне свету асоба чалавека вывучаецца з самых розных пунктаў гледжання і з самых розных падыходаў.

У лексіцы любой мовы ёсць дзве спецыяльныя катэгорыі слоў: **пеяратывы** (словы або словазлучэнні, якія выражаюць негатыўную ацэнку чаго-небудзь) і **меліяратывы** (словы або словазлучэнні са станоўчай ацэнкай).

Выразіць сутнасць эмоцыі шляхам слоўнага выражэння немагчыма без ведання элементарных псіхічных працэсаў, якія суправаджаюць вербальнае ці кінестэтычнае праяўленне эмацыйнага рэагавання. Эмоцыі ўплываюць на спосаб мыслення і ўспрымання свету, а таксама рэгулююць характар паводзін чалавека. Напрыклад, Г. Х. Шынгараў указваў, што фізіялагіныя працэсы, якія працякаюць падчас эмацыянальнага рэагавання, уключаюць у сябе і

«настройку аналізатараў», тым самым уплываючы і на іншыя псіхічныя працэсы. Таму дзейнасць, якая «падтрымліваецца эмоцыямі, працякае куды больш паспяхова, чым тая, да якой ён сябе прымушае аднымі толькі «халоднымі довадамі розуму». Унутры эмацыйнага перажывання функцыянуе яшчэ і мысленне [1, с. 16—28 і 156].

Абапіраючыся на класіфікацыю фундаментальных эмоцый К. Ізарда, можна сутыкнуцца з цяжкасцю аднясення эмоцыі да канкрэтнай групы. Напрыклад, адна і тая ж лексема можа называць эмоцыі з розных груп. Відаць, з гэтай прычыны некаторыя з 10 прапанаваных груп з’яўляюцца дыядамі. Так, мы пастараемся прадставіць разнастайнасць лексікі, якая прадстаўляе групу меліяратыўных найменняў на прыкладзе дыяды «задавальненне — радасць». У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» радасць вызначаецца як «пачуццё вялікай асалоды, задаволенасці, якое выклікае вясёлы настрой; весялосць, трыумф, прыемныя, вясёлыя перажыванні, выкліканыя чым-небудзь».

Даследаванні па псіхалогіі паказваюць, што і ступень праяўлення радасці, і прычыны, што яе выклікаюць, і фактары, што суправаджаюць яе ўзнікненне, прыводзяць да варыятыўнасці канчатковага выніку. Таму эмоцыя як псіхічная з'ява часта перажываецца разам з кінестэтычнымі праявамі: *блазнавацца, гарэзнічаць, дурэць, жартаваць, жвавець, загігікаць, засмяяцца, зарагатаць, парагатаць, пасмейвацца, пасмяяцца, скаліцца, смяшок, смяшынка, смяяцца, усміхацца, ухмылка, ухмыльнуцца, ухмыляцца, уціханне.*

Знакаміты псіхолаг К. Ізард прытрымліваецца думкі, што яе [радасці] перажыванне неабавязкова вызначаецца спецыфічнай сітуацыяй ці дзеяннем. Гэта, хутчэй, пабочны «прадукт» успрымання, мыслення або дзеяння. Радасць можа ўзнікаць на розных стадыях творчай працы, пры адкрыцці новага» (*абнадзеіцца, адухоўлены, азарыцца, (азарэнне), акрыліцца, бадзёрыцца, весялець, жвавець (жвавы), жывасць (жыва), задавальняцца, задавольвацца, захапляцца (захапленне), ззяць (ззянне), павесялець, падбадзёрыцца, лікаваць (лікаванне))*, «ужыванні ежы і напояў, якія задавальняюць голад і смагу, ці ў выніку таго, што змяншае напружанне, гнеў, агіду, грэбаванне, страх ці сорам, якія ўрываюцца ў паўсядзённае жыццё» [2, с. 213] ( *палёгка, абмякнуць, акрыяць, дабрэць, задавальняцца (задаволены), залагоджвацца (залагоджаны), замілавацца, засмяяцца, зарадавацца, зацвісці, лагода, лагоднасць, змякчыцца, змякэчць, ласкавець, мякнуць, мякчэць, падабрэць, падацца, палагаднець, павесялець, паласкавець, спакайнець, супакоіцца, сцішыцца, уціхамірыцца).* Перажыванне радасці нярэдка ўзнікае не толькі ад канкрэтных падзей, а і падчас мар, мрояў наяве і падобных формаў уяўлення (*летуцець, лунаць, праяснець, святлець, свяціцца*). Выявіць такія працэсы ў чалавека можна і візуальна – па выразе твару ці асаблівым бляску вачэй.

Цэнтральнае месца ў спектры пеярарыўных найменняў займае базавая эмоцыя *гневу*. На думку Ізарда, «гнеў – гэта фундаментальная эмоцыя, кантролю над выражэннем якой адводзіцца значная ўвага ў працэсе сацыялізацыі. Знешнія праявы гневу лёгка распазнавальныя: кроў <кіпіць>,

Рэпазіторый БДПУ

твар пачынае гарэць. Хутка мабілізаваная энергія напружвае мышцы і выклікае адчуванне сілы, пачуццё храбрасці, ці ўпэўненасці ў сабе. Хаця гнеў і адыгрываў важную ролю ў працэсе эвалюцыі, яго функцыі ў сучаснага чалавека невялікія». Гэта сведчыць пра тое, што Ізард лічыць гнеў адной з важнейшых эмоцый [2].

Характэрнай асаблівасцю лексічных адзінак са значэннем эмоцыі гневу з'яўляецца іх уключэнне у розныя мадэлі семантычных дэрывацый, калі новае значэнне ўзнікае на базе ўжо існуючых у мове слоў. Характар першасных значэнняў у многім вызначае кірунак сэнсавага развіцця слова.

Назіраюцца наступныя семантычныя мадэлі: хвароба, расстройствы псіхічных працэсаў → высокая ступень праяўлення гневу, яго напружанасць (*вар'яцець, ашалець, абяспамяцець, гарэць; істэрычны, гарачлівы, гарачка, ачмурэць, ачумець, ачумелы*); фізічныя працэсы, звязаныя з вылучэннем высокай тэмпературы → узбуджаны стан, нервовая напружанасць (*накаліцца, накалены, гарачлівы, горача кіпець, раскіпецца, успыхнуць, пыхнуць, запальчывы, напал, перапалка, палыхаць, заірдзецца, распякаць*), а таксама нізкай (*сцюдзёны (позірк)*); гукавыя выяўленні, часцей за ўсё зыходнай кропкай з'яўляецца форма праяўлення агрэсіі жывёламі → праяўленне эмоцый гневу на вербальным узроўні (*аблаяць, лаяцца, палаяцца, абрахаць, з'яхіднічаць, пагаўкацца, лаяць, вылаяць, рыкаць, сабачыцца, гыркацца, раўці*).

Перажыванні, эмоцыі чалавека заўсёды трэба разглядаць праз прызму канкрэтнай мовы. У беларускай мове лексіка, якая рэпрэзентуе праяўленне пеяратыўных эмоцый , дастаткова багатая і разнастайная як у колькасных адносінах, так і з боку семантычнай варыятыўнасці і складае перавагу перад меліяратыўнымі эмацыйнымі найменнямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Шингаров Г.Х. Эмоции и чувства как формы отражения действительности. М., 1971.

2. Изард, К. Эмоции человека / К. Изард; пер. с англ.; под ред. Л.Я. Гозманова. – М.: Изд-во МГУ, 1980. – 439 с